ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
10 КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 26 (1476)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### БЮРО ПАРТКОМА

разгледзела пытанне аб ходзе рэалізацыі плана мерапрыемстваў па выкананню пастановы бюро ЦК КПБ «Аб рабоце рэктарата і парткома БДУ імя У. І. Леніна па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у святле рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС і крытычных заўваг Дзяржінспекцыі МінВНУ СССР».

З асноўным дакладам па гэтаму пытанню выступіў сакратар парткома М. І. Дзямчук. У спрэчках выступілі А. Ц. Пікулеў — загадчык вучэбна-метадычнага цэнтра, М. І. Казлоўскі — выконваючы абавязкі прарэктара па навуковай рабоце, А. Г. Слука — намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце, Л. П. Яноўская — загадчыца аддзела аспірантуры, Р. А. Мужычэнка — сакратар партбюро НДЧ, Л. І. Кісялеўскі — рэктар універсітэта.

З пытаннем аб рэалізацыі крытычных заўваг, выказаных на III справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі ў 1983 годзе, выступіла намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце Л. А. Паўловіч.

Заслухана таксама паведамленне аб выніках справаздач і выбараў у пярвічных партыйных арганізацыях у 1985 годзе.

У рабоце бюро парткома прыняў ўдзел інструктар ЦК КПБ П. І. Брыгадзін.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

### ДЗЕНЬ ПРАПАГАНДЫСТА

прайшоў у БДУ імя У. І. Леніна. Адкрыў яго намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце А. Г. Слука. З дакладам «Усе магчымасці і рэзервы — на паспяховае выкананне плана 1985 года і сацыялістычных абавязацельстваў, дастойную сустрэчу XXVII з'езда КПСС» выступіла загадчыца кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў прафесар І. І. Жбанкова. У спрэчках выступілі прафесары С. Я. Янчанка і Г. П. Давыдзюк, дацэнт В. В. Левый.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### ПРАВОДЗІЦЦА

месячнік кнігі, прысвечаны пачатку новага навучальнага года. На працягу яго ў кніжным кіёску БДУ імя У. І. Леніна можна набыць наступныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі: Бицадзе А. В., Калинченко Д. Ф. «Сборник задач по уравнениям математической физики»; Булычёв А. Л. и др. «Аналоговые интегральные схемы» (Справочник); Мельский Н. В. «Дидактика математики»; Роговский И. Т. «Политическая экономия капитализма. Содержательно-логические схемы»; Сивухин Д. В. «Общий курс физики. Электричество»; Чертко Н. К. «Геохимия ландшафтов».

А. ПАДАЛКА.

## XXVII з'езду КПСС — дастойную сустрэчу!

# ДЫЯЛЕКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

**Адбыўся сход прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў універсітэта. З дакладам «Вынікі 1984—1985 навучальнага года і задачы калектыву універсітэта па далейшаму ўдасканаленню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» выступіў рэктар, акадэмік АН БССР ЛЕАНІД ІВАНАВІЧ КІСЯЛЕЎСКІ. Прапануўваем тэкст даклада ў скарачэнні.**






З КОЖНЫМ ДНЁМ у нашай краіне набірае тэмп падрыхтоўка да чарговага XXVII з'езда КПСС. Як падкрэслівалася ў дакладзе рэктара, сёння і мы павінны падвесці вынікі нашай работы за 1984—1985 навучальны год, абагульніць назапашаны станоўчы вопыт, прааналізаваць недахопы і нявыкарыстаныя рэзервы, намеціць у адпаведнасці з патрабаваннямі часу шляхі далейшага ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу, якасці падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання спецыялістаў.

У 1984—1985 навучальным годзе адбыліся пэўныя зрухі ў паляпшэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Гэтыя пытанні былі пастаянна ў полі зроку рэктарата, парткома, грамадскіх арганізацый. На ўсіх факультэтах разам з удасканаленнем традыцыйных развіваліся новыя перадавыя формы і метады навучання, у тым ліку з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў і электронна-вылічальнай тэхнікі.

Выкладанне грамадскіх дысцыплін стала больш цесна суадносіцца з жыццём у адпаведнасці з патрабаваннямі XXVI з'езда КПСС, чэрвеньскага (1983 г.) і красавіцкага (1985 г.) Пленумаў ЦК КПСС.

Адбылося далейшае ўмацаванне сувязі паміж вучэбным працэсам і навуковымі даследаваннямі, былі прыняты меры па шырокаму далучэнню моладзі да гэтых даследаванняў. Пашырылася творчае супрацоўніцтва універсітэта з прамысловымі прадпрыемствамі і навукова-даследчымі ўстановамі. Назапашаны значны вопыт інтэрнацыянальнага і ваенна-патрыятычнага выхавання, асабліва ў сувязі з падрыхтоўкай і святкаваннем 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчынай вайне.

Нашы поспехі абумоўлены вялікай творчай актыўнасцю прафесарска-выкладчыцкага саставу, яго

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## ДА 800-ГОДДЗЯ «СЛОВА АБ ПАЛКУ ІГАРАВЫМ»

# ЗАЛАТОЕ СЛОВА РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

«СЛОВА АБ ПАЛКУ ІГАРАВЫМ» — геніяльны твор старажытнай рускай літаратуры, прысвечаны падзеям 1185 года. Прайшлі стагоддзі, але не паменшылася паэтычнае гучанне твора. Багацці гэтага невялікага памерам шэдэўра невычэрпныя. У ім крыху больш за 2800 слоў, але кожнае з іх важкае, глыбокае, выкарыстана да месца.

Гэты твор выклікае вялікую цікаўнасць чытачоў і прыцягвае да сябе ўвагу гісторыкаў, географаў, моваэнаўцаў, літаратуразнаўцаў, паэтаў, мастакоў. Яго перакладалі на сучасную рускую мову В. Бялінскі, В. Жукоўскі, А. Майкаў, Л. Мей, а ў савецкі час — І. Новікаў, М. Забалоцкі, М. Рыленкоў і іншыя. Ілюстравалі «Слова» вядомыя мастакі з Палеха І. Голікаў і Р. Белаусаў, а таксама У. Наскоў, Г. Захараў, С. Рубцоў, Б. Чупрыгін, У. Сямёнаў і іншыя.

Першае друкаванае выданне «Слова аб палку Ігаравым» выйшла ў 1800 годзе. За гады савецкай улады гэты твор выдаваўся больш чым 20 разоў агульным тыражом звыш 8 млн. экземпляраў.

У аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі фундаментальнай бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна захоўваюцца лепшыя выданні гэтага твора. Чытачы бібліятэкі могуць пазнаёміцца з факсімільным аднаўленнем першага друкаванага выдання, якое было выпушчана выдавецтвам «Савецкая Расія» у 1981 годзе, выданнем 1950 года АН СССР з серыі «Літаратурныя помнікі», выпускам 1971 года «Слова аб паходзе Ігаравым, Ігара сына Святаслава, унука Алегава» у перакладзе і падрыхтоўцы тэкста акадэміка Д. С. Ліхачова з ілюстрацыямі мастака У. Сямёнава.

Выдавецтвам «Акадэмія» у 1934 годзе было выдадзена «Слова аб палку Ігаравым», праілюстраванае вядомым палехскім мастаком Іванам Голікавым. Больш чым праз сорак гадоў ужо выдавецтва «Сучаснік» перакладае гэты твор з ілюстрацыямі І. Голікава, якія сталі сапраўды жамчужынай рускага выяўленчага мастацтва. Гэта Залатая кніга Палеха захоўваецца ў нашым аддзеле. Тут прадстаўлены таксама мініяцюрныя і малафарматныя выданні «Слова».

У 1984 годзе выдавецтва «Юнацтва» выпусціла «Слова аб палку Ігаравым» у перакладзе на беларускую мову Я. Купалам (афармленне мастака Г. Паплаўскага). З гэтым цудоўным выданнем таксама можна пазнаёміцца ў адзеле рэдкай і каштоўнай кнігі.

Л. МІЦКЕВІЧ,
загадчыца аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі.

**XXVII З'ЕЗДУ КПСС — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!**

# ДЫЯЛЕКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

высокай кваліфікацыяй, добрасумленнымі адносінамі да сваіх вытворчых і грамадскіх абавязкаў.

Сёння падрыхтоўка спецыялістаў ва універсітэце ажыццяўляецца на 11 факультэтах па 16 спецыяльнасцях і 82 спецыялізацыях. Вучэбна-выхаваўчы працэс вядуць 103 кафедры, на якіх працуюць 1368 выкладчыкаў — 5 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, 95 прафесараў, дактараў навук і 697 дацэнтаў, кандыдатаў навук. Акрамя таго, на педагагічнай рабоце на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва працуюць 37 выкладчыкаў і з пагадзіннай аплатай 446 выкладчыкаў, сярод якіх 13 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, 26 доктараў навук, 153 кандыдаты навук.

Пяць факультэтаў узначальваюць прафесары, доктары навук, загадчыкамі кафедраў працуюць 50 доктароў навук, прафесараў, 42 кандыдаты навук, дацэнты.

Прыведзеныя дадзеныя сведчаць аб тым, што універсітэт мае высокакваліфікаваныя кадры выкладчыкаў і можа паспяхова вырашаць пастаўленую перад ім задачу — рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для патрэб народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Паспяховасць студэнтаў універсітэта па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі 1984—1985 навучальнага года склала па дзённай форме навучання 91,74 працэнта (у мінулым годзе 91,6 працэнта), вячэрняй — 81,4 працэнта (мінулы год — 81,5 працэнта), завочнай — 79,4 працэнта. Па дзённай форме навучання 50,13 працэнта (мінулы год — 51,2 працэнта) студэнтаў займаюцца на «добра» і «выдатна».

Найбольш высокая паспяховасць на геаграфічным (96,56 працэнта), юрыдычным (95,26) факультэтах і факультэце журналістыкі (94,83 працэнта).

Але разам з тым нельга не бачыць таксама вузкіх месц. Нас не можа не хваляваць тое, што ў цэлым па універсітэту 3,87 працэнта студэнтаў займаюцца толькі на «здавальняюча», а 8,26 працэнта атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Усё яшчэ вялікі адсеў студэнтаў за непаспяховасць і парушэнне дысцыпліны.

Дэканаты, кафедры, асобныя выкладчыкі яшчэ не ўсё робяць для павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, своечасовага аднаўлення яго зместу, фарміравання ў студэнтаў грунтоўнай сістэмы ведаў, умення, навыкаў, развіцця творчых здольнасцей. Недастаткова вядзецца работа па ўдасканаленню падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове кваліфікацыйных характарыстык, у якіх вызначаюцца патрабаванні да выпускніка універсітэта, што прад'яўляюцца канкрэтнай галіной народнай гаспадаркі.

Якасць выпускаемых спецыялістаў у многім залежыць ад прынятых на першы курс студэнтаў. Ва універсітэце праводзіцца вялікая прафарыентацыйная і агітацыйна-прапагандысцкая работа па заахвочванню ў паступленні ў БДУ найбольш здольнай і падрыхтаванай моладзі. Дзякуючы актыўнаму выкарыстанню розных форм і сродкаў прафарыентацыйнай работы, у бягучым навучальным годзе ў параўнанні з мінулымі забяспечаны больш высокі конкурс на дзённую форму навучання. У справаздачным годзе на ўсе формы навучання было пададзена ад медалістаў сярэдніх школ і выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў з дыпломамі з адзнакай 974 заявы (у 1984 годзе — 927), больш за 80 працэнтаў паступаючых мелі сярэднія балы атэстатаў 4,5 і вышэй.

Як вядома, поспехі ў любой справе залежаць ад наяўнасці высокакваліфікаваных кадраў. Аднак мы не можам пахваліцца, што з гэтым у нас усё добра. Універсітэт слаба папаўняецца маладымі кадрамі.

Нізкая яшчэ эфектыўнасць работы аспірантуры як асноўнай крыніцы папаўнення навукова-педагагічных кадраў. Толькі 10—12 працэнтаў аспірантаў універсітэта заканчваюць аспірантуру з абаронай дысертацый. Нам неабходна ўсямерна павышаць адказнасць навуковых кіраўнікоў аспірантаў, карэнным чынам палепшыць планаванне набору ў аспірантуру літаральна на ўсіх кафедрах універсітэта.

У 1984—1985 навучальным годзе працягвалася далейшае ўмацаванне сувязі вучэбнага працэсу з навуковымі даследаваннямі, да якіх шырока далучаліся студэнты. Па выніках НДР студэнтамі самастойна або ў сааўтарстве апублікавана 719 артыкулаў і тэзісаў дакладаў у матэрыялах навуковых канферэнцый, сімпозіумаў, усесаюзных і рэспубліканскіх часопісах. 21 студэнт стаў сааўтарам заявак на вынаходніцтвы, 16 з іх атрымалі станоўчыя рашэнні.

І ў арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў ёсць шэраг недахопаў. На некаторых факультэтах яна жадае быць значна лепшай. Слаба вядзецца планаванне НДРС. На пасяджэннях кафедраў рэдка абмяркоўваюцца пытанні студэнцкай НДР. З гэтымі негатыўнымі з'явамі патрэбна весці барацьбу.

Неабходна праявіць максімум увагі да студэнцкай навукі, па меры магчымасці развіваць творчыя здольнасці студэнтаў. Да кіраўніцтва студэнцкімі навуковымі даследаваннямі неабходна прыцягваць вядучых выкладчыкаў і навуковых работнікаў. У арганізацыі студэнцкай навукі павінен больш эфектыўна выкарыстоўвацца навуковы патэнцыял нашых навукова-даследчых інстытутаў — НДІ ПФП і НДІ ФХП.

У бягучым навучальным годзе універсітэт, як ВНУ, якая рыхтуе педагагічныя кадры для работы ў агульнаадукацыйнай і прафесійнай школе, працягвае перабудову сваёй дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона аб школьнай рэформе, мерапрыемствамі МінВНУ БССР па гэтаму пытанню.

Складзены і зацверджаны саветам план мерапрыемстваў па выкананню Закона «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы» і план па рэалізацыі пастановы бюро ЦК КПБ і заўваг Дзяржінспекцыі МінВНУ СССР па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у святле рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС. Задача ў тым, каб своечасова і на належным узроўні выконваць усе намечаныя мерапрыемствы. Ход іх выканання патрэбна ўзяць пад строгі кантроль, абмеркаваць на кафедрах, саветах факультэтаў, ва ўсіх структурных падраздзяленнях.

Зараз на ўсіх факультэтах, якія рыхтуюць настаўнікаў, распрацоўваюцца планы бесперапыннай педагагічнай практыкі, пачынаючы з першага і канчаючы пятым курсам. Найбольш удала распрацаваны гэты план на філалагічным факультэце. Ён рэкамендаваны на іншых факультэтах. Вучоныя універсітэта прыступілі да напісання серыі брашур «Вучоныя універсітэта — школе».

Асобым пытаннем было і застаецца пытанне аб педагагічным майстэрстве, якасці праводзімых заняткаў.

Нашы намаганні павінны быць па-ранейшаму накіраваны на абнаўленне зместу вучэбнага працэсу. Неабходна актыўна шукаць шляхі павышэння прадукцыйнасці разумовай працы выкладчыкаў і студэнтаў, новыя прагрэсіўныя формы і метады арганізацыі вучэбнага працэсу.

Важнае значэнне для замацавання атрыманых студэнтамі ведаў мае вытворчая і педагагічная практыкі. У справаздачным годзе факультэты многа папрацавалі над удасканаленнем практык, развіццём іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. Зараз ва універсітэце 656 баз практыкі. Сярод іх — перадавыя вытворчыя аб'яднанні і прадпрыемствы, НДІ, школы, рэдакцыі газет і часопісаў, установы суда, пракуратуры і г. д. Часта базы практык супадаюць з месцамі будучай работы студэнтаў. Гэта дазваляе будучым спецыялістам яшчэ ў студэнцкія гады глыбей пазнаваць канкрэтныя праблемы сваёй прафесіі, а пасля заканчэння універсітэта хутчэй адаптіравацца на вытворчасці. Асабліва паспяхова праходзіць практыка студэнтаў там, дзе універсітэт мае дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы маладых спецыялістаў. Па мэтавых дагаворах універсітэт падрыхтаваў для прадпрыемстваў рэспублікі ў 1984 годзе каля 500 спецыялістаў. Аднак магчымасці мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце яшчэ не вычарпаны.

Вядома, што педагагічныя поспехі універсітэта знаходзяцца ў прамой залежнасці ад таго, наколькі маштабная і плённая навуковая работа кафедраў, выкладчыкаў, як шырока ўключаны ў яе студэнты. На красавіцкім (1985 г.) Пленуме ЦК КПСС адзначалася, што ВНУ здольны значна павялічыць аб'ём навукова-даследчых работ. Гэта датычыцца і нашага калектыву.

У 1984 годзе ва універсітэце выконваліся навуковыя даследаванні па 455 тэмах. Універсітэт удзельнічае ў выкананні заданняў 74 саюзных, рэспубліканскіх, міжнародных і галіновых праграм па 167 тэмах НДР (37,5 працэнта). Па шэрагу буйных раздзелаў і заданняў праграм універсітэт з'яўляецца галаўной арганізацыяй, а па міжведамаснай праграме работ МінВНУ БССР, Міністэрстваў аховы здароўя БССР і Латвійскай ССР па атрыманню высокаэфектыўных лекавых прэпаратаў з цэлюлозы НДІ ФХП з'яўляецца галаўным выканаўцам работ. Многія нашы работы, а таксама іх выканаўцы атрымалі усесаюзнае і рэспубліканскае прызнанне.

І ўсё ж далейшае развіццё навукова-даследчай работы стрымліваецца шэрагам фактараў. У арганізацыі навуковых даследаванняў па-ранейшаму важнейшай задачай з'яўляецца адмаўленне ад малазначных тэм, канцэнтрацыя сіл і сродкаў на важнейшых напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу, атрыманне большага эфекту ад укаранення вынікаў НДР у вучэбны працэс, павелічэнне навукова-тэхнічных распрацовак, якія прымаюцца да серыйнай вытворчасці.

Вялікая ўвага рэктарата, дэканатаў, грамадскіх арганізацый у справаздачным навучальным годзе ўдзялялася пытанням фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду, ідэйна-маральнага, патрыятычнага, інтэрнацыянальнага выхавання студэнцкай моладзі. Пытанні камуністычнага выхавання студэнтаў і надалей павінны займаць важнае месца ў нашай дзейнасці.

Выступаючы на сустрэчы з ветэранамі стаханаўскага руху, перадавікамі і наватарамі вытворчасці, М. С. Гарбачоў падкрэсліў: «Мы імкнёмся да таго, каб у нашых справах было больш галоснасці аб усіх сферах жыцця грамадства. Людзі павінны ведаць і добрае, і дрэннае з тым, каб добрае прымнажаць, а з дрэнным весці непрымірымую барацьбу». Інструментам галоснасці ў нас з'яўляецца друкаваная трыбуна калектыву — газета «Беларускі універсітэт». Абапіраючыся на навукова распрацаваную канцэпцыю, рэдакцыя газеты плённа выконвае ўскладзеную на яе функцыю. Працэс паскарэння ўсяго нашага грамадства патрабуе далейшай актывізацыі дзейнасці і друкаванага органа парткома, рэктарата, камсамольскага і прафсаюзных камітэтаў. Думаецца, што неабходна больш рэгулярна выступаць на старонках газеты загадчыкам кафедраў, дэканам, вядучым вучоным і выкладчыкам. Патрэбна ўсямерна прапагандаваць лепшы вопыт вучэбнага працэсу, эфектыўныя навуковыя распрацоўкі, паказваць узоры педагагічнага майстэрства. Разам з гэтым газета «Беларускі універсітэт» павінна своечасова і аператыўна заўважаць і падвяргаць крытыцы недахопы ў рабоце асобных структурных падраздзяленняў, выкладчыкаў і студэнтаў, наступальна змагацца за ўмацаванне дысцыпліны і арганізаванасці, прапагандаваць здаровы лад жыцця. Толькі пры ўмове шырокай інфармаванасці магчыма ўкараненне ў наша жыццё ўсяго лепшага, што назапашана ў асобных падраздзяленнях, выкараненне недахопаў.

Дзейсным фактарам развіцця прынцыпа галоснасці на нашых факультэтах абавязаны стаць і насценны друк. Аднак, як паказвае практыка, насценныя газеты не заўсёды выконваюць сваю місію. Нашаму насценнаму друку пакуль характэрны святочны настрой — газеты прысвечаны ў асноўным юбілеям і датам, хаатычна і бессістэмна адлюстроўваюць актуальныя пытанні вучэбна-выхаваўчага працэсу, пакутуюць бяззубасцю ў пастаноўцы набалеўшых праблем, аморфныя ў крытычным аналізе недахопаў. Відаць, надышоў час разгледзець пытанне аб ролі насценнага друку ў паляпшэнні вучэбна-выхаваўчай работы на сумесным пасяджэнні рэктарата і парткома. Але ўжо зараз становішча патрэбна выпраўляць, актывізаваць дзейнасць насценнага друку, нацэльваць яго на асвятленне і рашэнне надзённых пытанняў.

Патрабуе паляпшэння арганізацыя вольнага часу студэнтаў. Куратары груп, камсамольскія і прафсаюзныя камітэты нярэдка фармальна падыходзяць да правядзення культурна-масавай работы ў інтэрнатах. Не ўстаноўлены належныя кантакты паміж прафбюро, студсаветамі і камітэтамі камсамола ў пытаннях арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў. Нездавальняюча працуюць каменданты некаторых інтэрнатаў. Яны не заўсёды інфармуюць дэканаты факультэтаў аб парушэннях студэнтамі правіл унутранага распарадку. Многія пакоі ў інтэрнатах знаходзяцца ў антысанітарным стане, ёсць выпадкі псавання сацыялістычнай маёмасці. З гэтымі негатыўнымі з'явамі патрэбна весці рашучую барацьбу.

**Па дакладу рэктара прынята пастанова, у якой указаны канкрэтныя шляхі паляпшэння дзейнасці універсітэта па дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС.**

# ТЭЛЕГРАМА Ў НУМАР

Мексіканскі народ падвергся небываламу стыхійнаму бедству — у выніку землятрасення 19, 20 верасня адбыліся вялікія разбурэнні ў многіх мексіканскіх гарадах, і асабліва значныя — у сталіцы Мехіка. Колькасць загінуўшых толькі ў гэтым горадзе складае каля 3500 чалавек, параненых — каля 20 000 чалавек. 10 000 сем'яў засталіся без жылля і хатняга ўжытку.

Камсамольцы абодвух сельгасатрадаў абавязуюцца адпрацаваць адзін дзень у фонд дапамогі мексіканскаму народу. Мы заклікаем студэнтаў усіх сельгасатрадаў Чавускага раёна паследаваць нашаму прыкладу і пералічыць заробленыя грошы ў Маскоўскі бюджэтны банк на рахунак № 700624.

*Ад імя студэнтаў сельгасатрадаў «Зарачанскі» і «Перадавік» Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна камандзіры І. КЛЯПІНІН, В. РЭПЧАНКОЎ.*



**ВОСЕНЬ ПРЫМАЕ ЭКЗАМЕН**

# ВЯСКОВЫ СЕМЕСТР

— КАПРЫЗНІЧАЕ надвор'е,— са скрухай адзначаў першы сакратар райкома камсамола М. Ермаковіч,— таму і перавялі студэнтаў з асноўнай работы — уборкі льнотрасты — некуды «пад дах».

Шэрая шапка неба, здавалася, насунулася на самы палетак, дзе, як ахапіць вокам, віліся цёмна-карычневыя стужкі выцерабленага льну.

Звыклае для нас паняцце «студэнцкая бульба» гучыць некалькі ўскосна прымяняльна да дзейнасці сельгасатрадаў, што дыслацыруюцца ў Шклоўскім раёне. Справа ў тым, што гектары, дзе вырошчваюць «другі хлеб», тут можна пералічыць па пальцах. Асноўная культура ў раёне — лён. А ён, як кажуць у народзе, любіць паклон.



Спецыяльных машын яшчэ вельмі мала. Таму ў час уборкі ўся надзея і стаўка шклоўскіх земляробаў на сваіх асноўных памочнікаў — студэнтаў. Да таго ж бульбу цяпер убіраюць выключна камбайнамі, вось і даводзіцца байцам сельгасатрадаў часам мяняць сваю спецыялізацыю.

— Памяркуйце самі,— гаворыць камісар Шклоўскага занальнага штаба студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў В. У. Казачонак,— у раёне працуе звыш 1000 студэнтаў, з іх 736 — з Белдзяржуніверсітэта. У спісе работ, якімі заняты сёння байцы атрадаў, першае месца займае ўборка льну, пасля ідуць буракі, і толькі пасля гэтага бульба, яе сартыроўка.



У сацыялістычным спаборніцтве, якое разгарнулася паміж атрадамі з першага дня працы, лідыруе атрад «Тэмп» факультэта прыкладной матэматыкі. Дарэчы, яго байцы выступілі са зваротам да ўсіх студэнтаў і навучэнцаў, якія працуюць на палях Шклоўшчыны.



Палову атрада складаюць першакурснікі. І, як ні дзіўна, імена яны паказваюць узоры працы. Алена Шумляева нават стала рэкардсменкай, перамагчы якую не ўяўляецца магчымым. Дзяўчына за змену падымае і вяжа па 600 снапоў ільнотрасты. Калі зазначыць, што кожны з іх амаль два кілаграмы, не цяжка ўявіць, з якой самаадданасцю працуе Алена. Мы ўбачылі ўвішную дзяўчыну, у якой усё, як кажуць, гарыць у руках. Хударлявая, са сціплай усмешкай, зусім яшчэ дзяўчо...

— Рэкорды ставіць у мяне і ў думках не было,— гаворыць Алена Шумляева,— працавала, здаецца, як усе. А калі падвялі вынікі — сама здзівілася. Цяпер прыходзіцца трымаць «марку». Увогуле, у нашым атрадзе ўзята за правіла дзённыя нормы выконваць на 150 працэнтаў.



Наступным адрасам нашага візіту быў калгас імя Фрунзе, дзе працуе атрад «Фартуна». Не першы год сюды прыязджаюць студэнты, якія спецыялізуюцца на кафедры матэматычнай фізікі ФПМ.



— З нецярпеннем чакалі мы іх і сёлета,— сказаў старшыня калгаса А. Г. Думлер.— Восень — у вёсцы работ восем. І дадатковыя рабочыя рукі — вялікая дапамога ў гэтую гарачую пару.

Сумнявацца ў шчырасці слоў кіраўніка гаспадаркі не прыходзіцца. Дзяўчат дастаўляе да месца працы і забірае на абед спецыяльна выдзелены для гэтай мэты адзін з калгасных аўтобусаў. Усім, хто меў патрэбу, выдалі новыя ватоўкі і гумавыя боты. Так што студэнтам ніякая напагадзь цяпер няўзнак.

Частка «Фартуны» занята на сартыроўцы насеннай бульбы, якую тут жа затарваюць у мяхі і рыхтуюць да адпраўкі ў Разанскую вобласць і Грузію. Кожны тыдзень змены мяняюцца. На просьбу назваць імёны лепшых камандзір атрада А. І. Глушцоў нават разгубіўся:

— Ведаеце, усе працуюць выдатна, цяжка каго-небудзь вылучыць. Хочацца адзначыць Вікторыю Ларчанкову, Аксану Парфёнаву, Жану Капыленка — студэнтак ФПМ, якія вызначаюцца сваёй нязрымслівасцю, аптымізмам і уласным прыкладам заахвочваюць сяброўак на працу.

**В. ГРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

**НА ЗДЫМКАХ:** Алена Шумляева; камісар Шклоўскага занальнага штаба студэнцкіх сельгастрадаў В. У. Казачонак уручае вымпел байцам атрада «Тэмп»; багаты ўраджай; «вось гэта бурак!»; ідзе сартыроўка бульбы; смачны абед згатавалі Святлана Шэндрык і Валянціна Шыдлоўская для сваіх таварышаў.

**Фота А. БЯЛЯСАВА.**




*Па ЛІФТу дзяжурыў В. Пярун.*

# МУДРАСЦЬ У РОЗНІЦУ

**Вучыцеся сумяшчаць на працы прыемнае з пабочным!**

**Целы расшыраюцца не толькі ад награвання, але і з гадамі.**

**Самая безадказная любоў — да сябе.**

**Рабіць разумны выраз твару — праца фізічная ці разумовая?**

**Калі бачыш, што ў цябе нічога не атрымоўваецца, значыць у цябе добры зрок.**

**Спаць на працы — выкарыстанне службовага становішча ў асабістых мэтах.**

**Улез у чужую скуру, каб захаваць сваю.**

**З любога дрэва флейты не зробіш, а дырыжорскую палачку — заўсёды.**

**Як шмат энергіі патрэбна, каб захаваць спакой!**

**Легенду, што ў чарцей ёсць рогі і капыты, выдумалі самі чэрці, каб іх ніхто не пазнаў.**

**Скажы мне што-небудзь пра таго, каго я ведаю, і я скажу хто ты.**

**У розыгрышы латарэі выйграюць усе ўдзельнікі: адны атрымоўваюць радасць ад выйгрышу, другія — ад гульні.**

**З-за інфармацыйнага выбуху ніяк не разабраць апошняга слова тэхнікі.**

**Чым далей у лес, тым танчэйшы культурны слой.**

С. Апенька.

## Зацьменне

*Хаты —*
*Белыя мядзведзі,*
*Гурбаў ланцугі...*

* * *

*Коні п'юць аблокі,*
*Сонца п'юць і сінь...*
*Лета, Шчара, коні,*
*Росны сенакос...*

* * *

*І дождж, і вятры,*
*і сухмень...*

Сяргей Чыгрын.

*Спачатку мядзведзі ляцелі*
*ў снягах,*
*А потым і коні ляжалі*
*ў аблоках.*
*І Шчара камегай мігцела*
*ў вачах,*
*І хаты, бы гурбы, сплывалі*
*далёка.*
*Дажджы і завеі, вятры*
*і сухмень,*
*Нібы электроды, у думках*
*сышліся...*
*Прачнуўся. Падумаў: а дзе*
*ж я быў дзень?*
*І як з сябруком мы тады*
*разышліся?*

## ПРАПАНУЕМ ПАСПРАБАВАЦЬ

# ПАЧАКАЙ, ПРАВУЧУ

— ПРАПАЎ,— падумаў Павел Піліпаў,— падглядзець паспрабуй.

Падазрона паглядзеў прафесар.

Павел пасядзеў, папазяхаў. Пастукаў пальцам па парце. Павярнулася Пятрова. Паціснула плячыма, паглядзела паверх Піліпава.

Падумаеш, паня, падказаць пабаялася. Пачакай, паскачаш!

Паша пасядзеў, пачухаў патыліцу. Памяць пуставала паранейшаму. Пішы прапала. Пачнеш плаваць — прафесар пару паставіць. Прасцей простага. Піліпаў пальцы прасунуў пад папругу... Памацаў паперкі. Пятая папарадку — прыгадаў. Пацягнуў, парасклаў пад партай. «Пабачым! Паспрачаемся!» — парадаваўся першакурснік.— Перадзяру, падкапайся пасля!»

Паднялася Пятрова. Пайшла. Піліпаву паківаў пальцам прафесар. Пагражаў.

— Падсёк,— пахаладзеў Паша.— Праўда, позна. Паспеў перакатаць.

— Павел Піліпаў,— паклікаў прафесар пасля Пятровай.

— Пачакайце, Пал Палыч, практыкаванне падпраўлю... Парадак. Пачну па чарзе. Пытанне першае.

— Паперку прынясіце. Пад партай паклалі, пажмакаць паспелі. Палічылі прастаком прафесара! Пралічыліся, Піліпаў!

Паша пачырванеў.

— Прагулялі, пралайдачылі. Прыйдзеце паслязаўтра. Пачытаеце, павучыце. Паходзіце, пакуль прыму.

Піліпаў падняўся. Пайду пасплю. Павучыць паспею. Паслязаўтра паставіць. Папрашу, паплачу, паскарджуся.

— Павучыце, павучыце,— перадражніў прафесара.— Пабачым. Паставіш! «Пара» паказчык падрэжа. Прападзе пальма першынства. Прэмія прападзе.

— Паставіць!— поўны перакананасці Паша пашлёпаў паціху пагуляць па парку. Падумаў: «Пятрову пашукаю. Пачакай, правучу. Папужаю парадкам. Пачне паважаць».

Паціху паплёўся.

# ПЫРСКІ

ФЕЛЬЕТОН

ПАЧУЦЦЕ гумару ў наш час на дарозе не валяецца. Кажучы вуснамі аднаго сімпатычнага героя з дзіцячых мультфільмаў, гэта як мёд: або ёсць, або няма. І жахлівая рэч, калі няма! Бо нямнога ў свеце людзей, у якіх адсутнічае пачуццё гумару, затое на месцы пачуццё, што няма гэтага пачуцця.

Часцей сустракаеш жартаўнікоў, у якіх ні таго, ні другога. А як «змарозяць» што-небудзь — млосна робіцца ад жадання у вочы такому майстру лёгкага жанру разануць усю праўду. Ды стрымліваеш сябе з апошніх сіл, каб не сарвацца выпадкам, каб не перайсці рубікон, не нагаварыць такога, што ні ў адным падручніку па лінгвістыцы не вычытаеш.

Часцей за ўсё такія, з дазволу сказаць, жарты выклікаюць не славуты здаровы смех, пяць хвілін якога замяняе кіло свежай морквы, а сумную ўсмешку. І калі сказанае адносіцца да асобы дзядзькі Федзі з гарадской вадакачкі, гэта яшчэ можна ўспрыняць. Але свядомасць наадрэз адмаўляецца ўспрыняць падобны факт абуральнага смехатворства, які мае месца ў сям'і студэнтаў. А яны, як вядома, ва ўсе часы былі і застаюцца заканадаўцамі смеху і гумару. Скажаце, так не бывае? Вось, напрыклад, у час мінулай сесіі ў інтэрнаце № 2... Аднак усё па парадку.

ГРАНІТ навукі грызці жадання не было. Тым больш, што экзамен быў не заўтра. А гэта значыць, што вольнага часу — цэлы воз і да яго яшчэ маленькая калясачка. Хочаш сядзі, хочаш ляжы, хочаш спі, а не — схадзі ў госці. Але ні адна з вядомых першакурсніцам фізфака І. Бачарнікавай і Л. Сяргеевай форм марнавання адпачынку іх не задавальняла.

Першай самотна пазяхнула Іра. А можа Люда. Сутнасць не ў гэтым. Факт, што між імі адбыўся дыялог прыкладна такога зместу.

— Ці не заўважыла ты, дарагая сяброўка, што апошнім часам студэнт нейкі дробны пайшоў?

— Чаму ж?

— Усе сумныя, бадзяюцца з маркотнымі тварамі адзін за адным. Ніякай табе славутай студэнцкай весялосці, ні паўнакроўнага студэнцкага жыцця!

— Дык сесія ж пачалася. Сама некалькі разоў спявала, маўляў, «ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела». А ў сесію, як бачыш, не да смеху.

— Ат, мана ўсё. Трэба толькі разварушыць усіх, жарт які ўвярнуць, каб адразу весела стала. Хадзем!

Студэнткі рашуча выпырхнулі ў інтэрнацкі калідор шукаць аб'ект і плацдарм для сваёй смехатворнай дзейнасці. А хто шукае, як вядома, знаходзіць. Хлопцы-аднакурснікі з галодным бляскам у вачах шыбавалі да ліфта.

— Усё вучым? — спытала адна з дзяўчат.

— Ага,— даў вычарпальны адказ калега-першакурснік.

— У сталоўку?

— Ага,— адпарыраваў усё той жа апанент.

— Ну дык мы вас абальём!

— Вы можа таго, перавучылі, дзяўчаты?— неяк на дзіва спагадліва спытаў юнак.

Будучыя фізікі ўжо набліжаліся да пункту грамадскага харчавання, вядомага ім пад нумарам пяць, як з вышыні дванаццатага паверха прагучала камандзірскае: «Плі!» І тут жа, з жахлівым свістам рассякаючы паветра, на небарак панесліся папяровыя пакеты з вадой. Не паспелі «бомбы» плюхнуцца на асфальт, як з разчыненнага акна пакоя 1203 пачуўся громападобны рогат. Дзяўчаты святкавалі перамогу. «Жарт» атрымаўся!

Справядлівасці дзеля зазначым, што ён абышоўся І. Бачарнікавай і Л. Сяргеевай па 15 рублёў, якія камсамолкі тут жа адлічылі ад сваёй стыпендыі ў якасці штрафу. За дробнае хуліганства. Астатнія іх сяброўкі спешна рэціраваліся з поля сатварэння жартаў, каб не прыняць удзел у гэтай выплаце кантрыбуцыі за сваё, як самі яны пасля ацанілі, разявацтва: «Гэта трэба, міліцыянера не заўважылі. А каб не ён — вунь як весела было б».

Можа ўчастковы інспектар і унёс такія-сякія карэктывы ў легкадумны падыход першакурсніц да такой сур'ёзнай, тонкай і далікатнай рэчы, як гумар. Але, думаецца, не лішнім будзе параіць гарэзам: каб жартаваць, таксама патрэбна розум мецъ, а то атрымаецца ў выніку не смех, а так сабе — адны пырскі!

Дзяжурны па ЛІФТу.

## АМАЛЬ СУР'ЁЗНА

# ВАРЫЯНТАЎ БЫЦЬ НЕ МОЖА

*— ЗАХОДЗЬЦЕ!*

*Расчыніліся дзверы. І пачалося... Размеркаванне.*

*— Дзень добры!—у аўдыторыю пругкай хадой спартсменкі зайшла Алена Жаўруковіч, белакурая прыгажуня з камсамольскім значком.*

*— Пра тое, што камсамолка, спартсменка і прыгажуня — казаць не стану. І так відаць,— пачаў куратар. — Вось яе характарыстыка. Зачытаю асноўныя пункты. Паступіла... Удзельнічала... Вучылася... Актыўная... Займалася.. Атрымоўвала... Карацей кажучы, таварышы, характарыстыка выдатная, дыплом таксама. У прафесуры нашага факультэта ёсць думка размеркаваць Алену Жаўруковіч у НДІ па кантролю за работай квантавых генератараў. Сёлета гэта ўстанова вылучыла месца...*

*— Прапіска?— спыніўшы позірк за паўметра ад выпускніцы, строга спытаў старшыня камісіі.*

*— Няма,— у роспачы прамовіла Алена і апусціла вочы, бы яе заспелі за нечым нядобрым.*

*— Паедзе ў саўгас аператарам ЭВМ па ўліку за надоямі ад кароў фермы брыгады нумар пяць.*

*— Наступны!*

*— Наступны!..*

*— Наступны!..*

*Нарэшце — апошні. Клім Казюркін. Дацягнуты да гэтага дня нечалавечымі намаганнямі дэканата, прафсаюзнай і іншымі грамадскімі арганізацыямі.*

*Куратар узяў у рукі сціслую характарыстыку, радкоў у пяць, не болей, уздыхнуў і пачаў. Не хадзіў... Не наведваў... Не вучыў... Вымова... Штраф...*

*Члены камісіі ў роспачы і разгубленасці павесілі галовы.*

*— У мяне прапіска!— з гонарам заявіў Казюркін.*

*— Ну тады гэта ў корані мяняе справу,— ажывіўся старшыня.— Накіроўваем вас у НДІ па кантролю за работай квантавых генератараў у якасці малодшага супрацоўніка.*

*Размеркаванне закончылася.*



## ЖАРТУЮЦЬ МАСТАКІ



## З сачыненняў абітурыентаў

***Бабуля пагладала на Чырвоную Шапачку ваўком.***

***«Запіскі Тургенева» напісаў нейкі паляўнічы.***

***Лопэ дэ Вега напісаў п'есу «Сабака на сцэне».***

***Галоўнае месца ў карціне Пікасо «Дзяўчынка на шары» займае мужчына на кубе.***

***Крыжаносцы хадзілі ў захапляючыя рабаўнічыя паходы.***

***Моцарт атруціў жыццё Сальеры.***

***Адкрыццё Пастэра мела шалёны поспех.***

***Калі бедную Лізу выцягнулі з сажалкі, яна маўчала, нібы вады ў рот набрала.***

***Чарцяня з ўджкасцю валачыла на сабе каня. Куды хутчэй конь скакаў пад Балдой.***

***Раптам Герман пачуў рыпенне рысораў. Гэта была старая графіня.***

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

10 кастрычніка 1985 г.
Зак. 2876. АТ 13744.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.